# Адказ на купалаўскую анкету*

Сёлета ў нумары 5 (287) „Б–ны“ Рэдакцыя абвесьціла купалаўскі апытаньнік. Здаецца мне, Рэдакцыя з гэтым паранілася (пасьпяшалася?): творства й асоба аўтара так яшчэ блізкая да нас, што цяжка аб’ектыўна ацаніць. Але калі ўжо апытаньнік абвешчаны, дык я хачу на яго коратка адказаць. Я знаў Янку Купалу ня толькі як паэту, але й добра асабіста.

Я цаню найвышэй тыя творы Купалавы, у каторых ён:

а) адтварае або адчувае мінуласьць беларускага народу,

б) зьвязуе мінуласьць із цяперашнінёй і асабліва з будучыняй, бяручы яе чыста за выхадзішча будучыні.

Вялікасьць паэты ў ідэйна–нацыянальным зьмесьце. Як добра разумеючы мінуласьць свайго народу, дасканальна разьбіраючыся ў цяперашнім часе і ведаючы, да чаго народ наш мае імкнуцца, Купала вельмі нацыянальны паэта, ён поўны грамадзянін і нацыянальны правадыр.

Да заганаў належыць тое, што Купала мала працаваў над тэхнічным бокам сваіх твораў. Быў ён таксама мала прадукцыйны. Віной, праўда, была савецкая атмасфэра, што забівала творства паэты, сонца й зоры. Віною было й тое, што шчырыя думкі нельга было яўна выказаць у савецка–расейскіх умовах. Але ўсё–ж такі шчыра тварыць можна было болей, а друкаваць пад іншай мянушкаю вонках „савецкага раю“. За межы гэтага „раю“ тады–сяды магчыма было перакінуць напісанае.

Мала паэта працаваў і над тым, каб ляпей а глыбей пазнаць беларускую мову, задавальняючыся звычайна тым ейным зьместам, што несьвядома засіліў у маленстве ў сваім кутку. Апраўданьнем тут можна было–б даць тое, што давялося стацца ў галіне мовы піянерам без моваведнае прыгатовы. З другога боку, адылі, прыраўнаньне з гэтага гледзішча Купалы да Гарэцкага або да Зарэцкага–Касянка, якія таксама ня мелі моваведнае прыгатовы, выходзіць не на карысьць Купалу.

# Пра Беларускую Сялянска–Работніцкую Грамаду

У № 4 (285) „Бацькаўшчыны“ сп–р С. Гаркуш, падаўшы ў варт. „Беларуская Сялянска–Работніцкая Грамада“ некаторыя ведамкі пра гэту партыю, кажа:

> Сяньня яшчэ ёсьць шмат навочных сьветкаў гэтае нядаўнае гісторыі. Спадзяюся, што яны таксама пададуць голас ды выявяць нашаму грамадзтву факты, якіх нельга было падаць да ведама ў „Бацькаўшчыне“, а таксама схарактарызуюць значэньне Грамады ў беларускім вызвальным руху.

Дыкжэ я гэта хачу зрабіць. Сп–р Гаркуш піша, што Беларуская Сялянска–Работніцкая Грамада была беларускай нацыянальнай партыяй. Гэта праўда, калі мець наўвеце масу гэтае арганізацыі. Маса была нацыянальна–беларуская. Праўда таксама, што Грамада пашырала і арганізавала беларускае культурнае жыцьцё ў заходняй Беларусі, а ня толькі вяла палітычную прапаганду.

Але кіраўніцтва Грамады, у тым ліку цэлы пасольскі клюб Грамады, былі камуністычнымі, зн., належылі да камуністычнае партыі. Камуністычны быў і партыйны апарат Грамады, праўда, зь некаторымі выняткамі. Тое, што кіраўніцтва Грамады было камуністычнай Масквою фізычна зьнішчана, не мяняе справы. Фізычна зьнішчаныя былі й беларускія камуністыя ў БССР.